# ЭМАТЫЎНАЯ ЛЕКСІКА Ў ТВОРАХ АНДРЭЯ МРЫЯ

С. Швец

У мове літаратурна-мастацкіх твораў эматыўная (ад лац. emotus «усхваляваны, узбуджаны») функцыя – адна з важнейшых функцый слова, якая дазваляе аўтару перадаць настрой, эмоцыі, перажыванні, душэўнае хваляванне персанажа, выказаць свае адносіны да яго. Эматыўная функцыя праяўляецца на ўсіх узроўнях сістэмы моўных адзінак, але найбольш часта – на лексічным і цесна звязана з канататыўным аспектам семантыкі слова.

«Канатацыя, -- як адзначае В.М.Тэлія, -- гэта прасцейшы механізм экспрэсіўнасці», яна ўяўляе сабой «семантычную сутнасць, якая ўзуальна або оказіянальна ўваходзіць у семантыку моўных адзінак і выражае эматыўнаацэначныя і стылістычна маркіраваныя адносіны суб'екта маўлення да рэчаіснасці» (1). Канатацыя як асобны кампанент лексічнага значэння надае слову экспрэсіўную значымасць, у выніку чаго ствараецца экспрэсіўна афарбаваная лексіка.

Паняцце эматыўнасці ў нашым мовазнаўстве, на жаль, не атрымала дастаткова поўнай распрацоўкі. Найбольш удалае, на наш погляд, азначэнне яго падае В.І.Шахоўскі: «Эматыўнасць – гэта лінгвістычны аспект катэгорыі эмацыянальнасці» (2). Пад эматыўнасцю намі разумеецца «лінгвістычнае выражэнне эмоцый, а пад эматыўным кампанентам значэння – тая семантычная доля, пры дапамозе якой моўная адзінка ажыццяўляе сваю эматыўную функцыю» (3). Мы цалкам пагаджаемся з такім азначэннем.

Лексіка мастацкіх твораў А.Мрыя характарызуецца выразнасцю, маляўнічасцю і каларытнасцю. Дзякуючы майстэрскаму ўжыванню моўных сродкаў з эмацыянальна-ацэначнай афарбоўкай празаік-сатырык надае моўнай «тканіне» твораў высокую эмацыянальнасць і экспрэсіўнасць.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У залежнасці ад характару суб'ектыўных пачуццяў – адносін гаворачай асобы і ад асаблівасцей ацэначных характарыстык людзей, з'яў, прадметаў у складзе эматыўнай лексікі выдзяляюцца словы са значэннем станоўчай і адмоўнай канатацыі.

Пры аналізе эматыўнай лексікі са значэннем станоўчай або адмоўнай канатацыі неабходна размяжоўваць змест самога слова і эматыўныя дамінанты (адабрэнне-неадабрэнне), у межах якіх і праяўляецца разнастайны спектр ацэначных значэнняў.

Да ліку эматыўнай лексікі са значэннем станоўчай канатацыі адносяцца ў першую чаргу назоўнікі і прыметнікі, якія выражаюць пазітыўныя эмацыянальна-ацэначныя адносіны – ласку, пяшчоту, павагу, пашану, спачуванне, ласкальнасць,памяншальнасць, замілаванне і інш. Адзначаныя ацэначныя значэнні ў творах А.Мрыя перадаюцца найчасцей формамі з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі: рыбачка, галубачка, дзіцёначак, рушнічок, вакешкі, Ганулька, Агатачка, родненькі.

Эматыўная лексіка са значэннем адмоўнай ацэнкі выражае дадатковыя семантычныя адценні – адносіны непавагі, непашаны, агіды, абразы, знявагі, асуджэння, пагарды, абурэння, іроніі, насмешкі і інш.. якія перадаюцца ў творах А.Мрыя як лексічнымі сродкамі (задавака, сляпец, дурыха, даўбель, хам, нахаба,прайдзісвет, шарлатан), так і словаўтваральнымі (неўдалюга, пышнёха, бабенцыя, галасішча, кашчэіха, таўшчэзны, махінозны).

Прадуктыўным спосабам стварэння канататыўнай афарбоўкі слоў і выразаў у творах А.Мрыя з'яўляецца асацыятыўна-вобразнае, найчасцей метафарычнае, пераасэнсаванне іх значэння: гэта назоўнікі заяц, крот, торба, чапяла (пра чалавека), прыметнікі крацінаая (праца), вужацкі (спакой), мышыныя (вочы), крухмальна-белыя (ручкі), лебядзіная (шыйка).

Сярод экспрэсіўных метафар у творах А.Мрыя неабходна адзначыць і своеасаблівыя метафарычныя аказіяналізмы: калупайства «марная праца», блыхарня «турма», дураскокі «неразумныя дзеянні», папераpсуй «пісака», мадаміст «бабнік», свістулянт «лёгкадумны чалавек», батонная (фігура) «поўная», прагалдамоніць «прагаварыць доўгі час», свістарэзнуцца «ўпасці» і інш.

У складзе эматыўных лексічных адзінак, ужытых А.Мрыем, значнае месца займаюць дзеяслоўныя адзінкі, утвораныя ад выклічнікаў і гукаперайманых слоў: мыгыкнуць, бахнуць, цыкнуць, айкнуць, вохаць і інш. Напр.: Нешта ўраілася майму Апанасу газету чытаць... Вечарамі сядзіць, сядзіць, пэкае, мэкае, гэкае, вэкае, аж упарыцца (4).

Такім чынам, Андрэй Мрый выкарыстоўвае ў сваіх творах багатыя і разнастайныя ў стылістычных адносінах эматыўныя назвы, эмацыянальна-ацэначная афарбоўка якіх ствараецца рознымі сродкамі – лексічнымі, лексіка-семантычнымі і словаўтваральнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Літаратура


1. Телия В.Н. Коннотавный аспект семантики номинативных единиц. – М., 1986. – С.121.
2. Шаховский В.И. Эмотивный компонент значения и методы его описания. – Волгоград., 1983. – С. 6.
3. Там жа. – С. 9.
4. Мрый А. Творы. – Мн., 1993. – С. 227.